# Уступ

“Палітычная гісторыя незалежнай Беларусі (1990-2006)” складаецца з тэкстаў, якія ўжо пабачылі сьвет у выданьнях Менскага аналітычнага грудка — “Беларуская палітычная сыстэма і прэзыдэнцкія выбары 2001” (2001), “Беларуска-расійская інтэграцыя” (2002), “Мясцовыя выбары ў найноўшай палітычнай гісторыі Беларусі” (2003), “Найноўшая гісторыя беларускага парлямэнтарызму” (2005) і нарэшце “Беларуская палітычная сцэна і выбары 2006 г.” (Першая ў гэтым шэрагу пазыцыя, “Беларуская палітычная сыстэма і прэзыдэнцкія выбары 2001”, нават стала бэстсэлерам і была цалкам прададзена за шэсьць месяцаў.) Ня ўвесь апублікаваны матэрыял вытрымаў выпрабаваньне часам, але ў цэлым ён захоўвае пазнавальную і аналітычную вартасьць. Ёсьць надзея, што яго перакампаноўка дазволіць дасягнуць новай якасьці ў разуменьні працэсаў і падзеяў, якія разам і складаюць найноўшую палітычную гісторыю Беларусі.

Маючы такі багаты і разнашэрсны зыходны тэкст, было бадай немагчыма дабіцца яго публікацыі згодна з прынцыпам храналягічнай лінейнасьці. У колькіх разьдзелах адбываецца ссоўваньне часавых пластоў — пазьнейшыя падзеі папярэднічаюць або накладаюцца на ранейшыя.

Гэтая кніга прызначана найперш будзіць палітычнае мысьленьне беларусаў і аб Беларусі.

Толькі заключны разьдзел “Сьпіс беларускіх палітыкаў” быў спэцыяльна перапрацаваны для гэтага выданьня і зьмяшчае інфармацыю, актуальную на момант другой паловы 2006 г. Усе астатнія тэксты даюцца без спэцыяльнай рэдакцыйнай праўкі. (Дзеля гэтага дзе–нідзе могуць стрэцца анахранізмы або храналягічныя няўвязкі.) Будзе добрым вынікам, калі некаторыя трактоўкі з пазыцыі сёньняшняга дня пададуцца штучнымі і нацягнутымі. Палітычны працэс не дапускае вытлумачэньня ў рамках адной правільнай інтэрпрэтацыяй, і ўсё толькі выйграюць ад яго больш шматмернага разуменьня.

*Валер Булгакаў.*
Варшава, кастрычнік 2006.